*Рыма Кавалёва*
*Тамара Некрашэвіч*

# ПРЫЧЫНЫ ЗНІКНЕННЯ І ЎМОВЫ АДРАДЖЭННЯ ЛАКАЛЬНЫХ СВЯТОЧНА-АБРАДАВЫХ ТРАДЫЦЫЙ НА ПАЛЕССІ

Беларусь з'яўляецца адной з тых краін славяншчыны, дзе і сёння існуе натуральная пераемнасць святочных традыцый на лакальным і рэгіянальным узроўні. Гэта не значыць, што беларусы захавалі літаральна ўсе каляндарныя святы і абрады ў жывым бытаванні. Частка знікла незваротна, і аб тым, што яны калісьці былі, цяпер можна даведацца толькі з успамінаў і нешматлікіх, часам адзінкавых запісаў, зробленых збіральнікамі ў XIX ст. Напрыклад, у сёмым нумары «Мінскіх епархіяльных ведамасцей» за 1874 г. было змешчана паведамленне С. Нячаева «Нешта з рэлігійных абрадаў і забабонаў у Бягомльскім прыходзе Барысаўскага павета», дзе распавядалася аб святкаванні Камаедзіцы, прысвечанай веснавому абуджэнню мядзведзя. Усе цырымоніі ў гэты дзень скіроўваліся на тое, «*каб мядзведзь лёгка ўстаў са сваёй зімовай бярлогі*» [1, *139*]. Абрад рэ-

гламентаваў ужыванне адпаведных рытуальных страў, прыемных, як лічылася, мядзведзю, – сушанага рэпніка, аўсянага кісялю, гарохавых камоў – а таксама паводзіны людзей: «*Пасля абеду ўсе – старыя і малыя – лажацца, але не спяць, а памінутна самым павольным спосабам перакатваюцца з боку на бок, як мага стараючыся прыладзіцца да паварочвання мядзведзя*» [1, *139*].

Трэба адзначыць, што да гонару беларускіх фалькларыстаў яны імкнуцца ўводзіць звесткі аб старажытным язычніцкім свяце продкаў у культурную свядомасць сучаснікаў. Так, Алесь Лозка ў кнізе «Беларускі народны каляндар» (Мн., 2002), узбагачаючы нашы ўяўленні аб мінуўшчыне, дакладна адзначыў дату правядзення Камаедзіцы – 6 красавіка, напярэдадні Звеставання, і даў разгорнуты каментарый да свята, спасылаючыся на меркаванні навукоўцаў наконт існавання культу мядзведзя. А дзякуючы намаганням Васіля Ліцьвінкі, беларусы штогод атрымліваюць «Каляндар абрадаў, свят і памятных дзён беларусаў», дзе пазначаецца не толькі Камаедзіца, але і шэраг унікальных палескіх абрадаў – «Ваджэнне і пахаванне стралы», «Ваджэнне Куста», «Провады русалкі». Такім чынам, пазафальклорныя спосабы трансмісіі надаюць асобным з'явам статус сімвалаў нацыянальнай культуры беларусаў.

Да парадоксаў навуковага бачання культурных з'яў адносяцца факты часовага выпадання з поля зроку даследчыкаў народных свят і абрадаў, чыё актыўнае жыццё ніколі не перапынялася і было трывала замацавана ў лакальных традыцыях. Тут дарэчы спаслацца на гісторыю вывучэння заходнепалескага куставога абраду, звесткі пра які неаднаразова з'яўляліся ў XIX ст. на старонках розных выданняў і спарадычна ў XX ст. Але толькі з пачатку 1970-х гадоў, пасля чарговага «адкрыцця» ваджэння Куста, пачалося грунтоўнае вывучэнне. У навуковы ўжытак уводзяцца сучасныя запісы куставых песень, нарэшце згадкі пра кустовую абраднасць з'яўляюцца ў падручніку «Беларуская вусна-паэтычная творчасць» для студэнтаў ВНУ (Мн., 2000), слоўніках, даведніках, энцыклапедыях, напрыклад у такім аўтарытэтным этналінгвістычным слоўніку, як «Славянскія старажытнасці» (Т. 3. М., 2004). Значнай падзеяй стаў выхад з друку першай кнігі У. І. Раговіча «Песенны фальклор Палесся: Песні святочнага календара» (Мн., 2001), дзе разам з варыянтамі змешчана 213 тэкстаў куставых песень – на парадак больш, чым за ўсё XIX ст. Самы поўны на сённяшні дзень збор куставых песень стаўся вынікам шматгадовай даследчыцкай працы аўтара на Палессі.

Ва ўмовах глабалізацыі, якая, здаецца, закранула культуру ўсіх еўрапейскіх краін, асаблівую актуальнасць набыла праблема захавання самабытнасці нацыянальных культур. Відавочная уніфікацыя мовы масавай літаратуры, візуальнага мастацтва, забаўляльна-відовішчнай сферы, факты інтэграцыі іншаэтнічных з'яў у сістэму нацыянальных каляндарных свят урэшце рэшт настолькі заклапацілі сусветную культурную эліту, што вынікам ініцыятыў стаў комплекс праграм і праектаў пад эгідай ЮНЕСКА, скіраваных на падтрымку традыцыйнай культуры народаў сусветнай супольнасці. У Парыжы на 31-й сесіі Генеральнай канферэнцыі ЮНЕСКА 2 лістапада 2001 г. была прынята «Усеагульная дэкларацыя аб культурнай разнастайнасці». Наступны год аб'яўляўся Годам Аб'яднаных нацый па культурнай спадчыне. У Мінску 8–10 ліпеня 2002 г. адбыўся Міжнародны сімпозіум «Разнастайнасць моў і культур у кантэксце глабалізацыі», напярэдадні якога прайшлі паседжанні круглых сталоў, тэма аднаго з іх – «Праблемы традыцыйнай культуры».

Вынікам працы 32-й сесіі Генеральнай канферэнцыі ЮНЕСКА (29 лістапада – 17 кастрычніка 2003 г., Парыж) стала «Міжнародная канвенцыя аб ахове нематэрыяльнай спадчыны». Пад ахoвай разумелася прыняцце на дзяржаўным узроўні пэўных мер, якія б дазволілі забяспечыць жыццяздольнасць традыцыйнай духоўнай спадчыны, абарону, папулярызацыю і адраджэнне розных яе бакоў. Зразумела, што развіццё і адраджэнне нацыянальных традыцый – сапраўды высакародная мэта. Але адразу паўстае пытанне, якім шляхам іх адраджаць, тым больш развіваць, што для гэтага трэба, пры якіх умовах магчыма сапраўднае, а не штучнае адраджэнне. Нельга абыйсці ўвагай тую сумную акалічнасць, пра якую сказаў доктар філасофскіх навук В. Пазнякоў: «...праблемы нацыянальна-культурнага развіцця аказваюцца, як гэта ні дзіўна, слаба распрацаванымі на тэарэтычна-метадалагічным узроўні» [3, *121*].

У сваім выступленні на згаданым сімпозіуме прафесар У. Скараходаў абсалютна правільна зазначыў: «Аўтэнтычны фальклор гістарычна адрозніваецца ад прафесійных і аматарскіх відаў мастацтва тым, што яго існаванне як спрадвечнай традыцыі для свайго развіцця, функцыянавання і перадачы не патрабуе арганізацыі на дзяржаўным узроўні... Перадача традыцый ажыццяўляецца, як правіла, у сям'і, у пэўным соцыуме, а не ў дзяржаўнай сістэме адукацыі» [3, *145*]. Фальклор сапраўды мае ўнутраныя механізмы і рэзервы самазахавання, але трэба браць у разлік і тое, што часам ён безабаронны перад ціскам пэўных знешніх абставін. Адзначым найбольш істотныя.

**1. Сацыяльна-палітычныя зрухі, якія здольны дэфармаваць этнічную свядомасць, пахіснуць паважлівае стаўленне да традыцыйнага фальклору і яго носьбітаў.** Як вядома, этнічная свядомасць з'яўляецца моцным фактарам уплыву на стан, захаванне і развіццё народнай культуры. А калі, напрыклад, каляндарныя святы і абрады на дзяржаўным узроўні, як гэта было ў савецкія часы, абвяшчаюцца забабонным цемрашальствам, то сумным наступствам падобнай ідэалогіі дзе-нідзе становіцца штучнае перарыванне лакальных традыцый. Якім чынам? Вельмі проста. Нам расказвалі, што дзецям, падлеткам, вучням старшых класаў пад пагрозай нездавальняючай адзнакі па паводзінах вельмі строга забаранялася ўдзельнічаць у каляндарна-абрадавых святкаваннях. Школьным настаўнікам ставілася ў абавязак не толькі праводзіць тлумачальныя гутаркі, але і дзяжурыць на вуліцах, сачыць і вышукваць сваіх выхаванцаў, якія, нягледзячы на забароны, рызыкнулі пакалядаваць, схадзіць на Купалле і г. д.

Праўда, як у свой час хрысціянства не здолела знішчыць язычніцкія святы, так і ўлада не здолела да канца перамагчы народныя традыцыі. З. Я. Мажэйка, якая ў 1960-я гады вывучала спеўную культуру Палесся, засведчыла, што ў в. Тонеж захаваўся звычай дзіцячага гукання вясны. Згодна з мясцовым азначэннем, ён мае назву *чыркаваць*. З упрыгожанай елачкай дзеці абыходзілі дамы родзічаў і знаёмых, вітаючы іх песняй «Ой, чыронька-пташэчка, ды не залетай далечко» [2, *56*]. Ці не таму і ў нашы дні ў в. Тонеж існуе масавае народнае святкаванне надыходу вясны, што тут заўсёды мела месца натуральная пераемнасць традыцыі? Тонежцы выходзяць за вёску, на пагорак, абавязкова бяруць з сабой рытуальныя стравы (вараныя яйкі, яешню, кашу, запечаны ў масле сыр) і спяваюць вяснянкі.

Трывалыя традыцыі дзіцячага калядавання характэрны для в. Глушкавічы Лельчыцкага раёна. У 1970-я гады адзін з аўтараў гэтага артыкула быў сведкай ранішняга калядавання дзяцей на першы дзень Нараджэння Хрыстова. Дзеці сказалі, што калядным спевам яны вучацца адзін ад аднаго, малодшыя ад старэйшых. У першай палове дня невялічкія гурты дзяцей наведваюць родзічаў і бліжэйшых суседзяў, каб павіншаваць з Калядамі. Абавязкова заходзяць да хросных бацькоў і бабкі. Іх чакаюць, загадзя рыхтуюць ласункі. А ўвечары, калі сцямнела, нехта пастукаў у акно і мы пачулі маладыя галасы: «*Дазвольце каляду заспяваць*!», але дзяўчынкі ўбачылі праз акно школьную настаўніцу, што сядзела разам з намі, і збеглі. «*Спужаліся*», – сказала тая, хаця школа ўжо не забараняла, як раней, калядаванне. Не забараняла, ды і не заахвочвала. Насцярожвалі і некаторыя зрухі ў свядомасці падлеткаў. Па словах Галі Гапановіч, малымі яны

заўсёды калядавалі, калі падраслі, то таксама, а потым перасталі: аднаго разу не пайшлі – і ўсё, як адрэзала. Чаму? Палічылі, што «выходзіць як прашэнне». Адкуль узялася беспадстаўная сарамлівасць? Вядома, не ад бацькоў, бо тыя ведалі, што калядуюць не проста так, а на добры ўраджай і сямейны дабрабыт. Відаць, на той час школа яшчэ не даводзіла да свядомасці вучняў, што трэба ганарыцца сваёй спадчынай, зберагаць і працягваць традыцыі, усведамляць, наколькі каштоўнымі ў культурным і эстэтычным плане з'яўляюцца народныя святы.

**2. Антрапалагічныя катастрофы.** Для Палесся, як і для ўсёй Беларусі, жудаснай катастрофай стала апошняя вайна. Войны змяняюць нармальны рух жыцця, наносяць непапраўныя псіхалагічныя траўмы, парушаюць умовы натуральнага працягу каляндарна-святочнай традыцыі. Напрыклад, пасля Вялікай Айчыннай вайны ў в. Дзяражычы Лоеўскага раёна, паводле сведчання жыхароў, знік характэрны для Усходняга Палесся абрад «Провады русалкі». «*Не да таго было*», – казалі жанчыны. Яго, як і адмысловую вулічную гульню «У русалку», захоўвае толькі памяць. Гульня цікавая тым, што ў ёй выкарыстоўваўся адпаведны рэквізіт для ўбрання «русалкі» – доўгая накідка і «галава»: калі «галава» была белая, то накідка чорная, і наадварот. Дзяўчына-русалка нічога не бачыла, бо накідка закрывала яе з галавы да пят. На сваёй галаве яна трымала рукамі «русалчыну», і гэтай «галавой» павінна была дакрануцца да таго, каго даганяла. Злоўленая дзяўчына ў сваю чаргу станавілася «русалкай».

**3. Усё большай пагрозай народнай культуры становяцца тэхнагенныя катастрофы, якія не абыходзяцца без экалагічных.** Аварыя на Чарнобыльскай АЭС запатрабавала перасялення палешукоў з забруджаных вёсак у новыя мясціны, што беспаваротна знішчыла лакальныя традыцыі. Наступныя пакаленні даведаюцца аб іх з былых публікацый, архіўных матэрыялаў ды апісанняў, зробленых фалькларыстамі, якія працавалі з перасяленцамі.

**4. Неспрыяльныя для натуральных спосабаў трансляцыі святочнай спадчыны дэмаграфічныя працэсы, парушэнне полаўзроставай раўнавагі ў вёсках, калі, па сутнасці, няма каму падхопліваць традыцыю.** Беларускае Палессе таму і набыла ў вачах славістаў статус своеасаблівага культурнага запаведніка, што тут здаўна існаваў пераемнасны дэмаграфічны падмурак прадукцыйнага бытавання каляндарных свят і абрадаў: вялікія вёскі, нязгубны для працягу традыцыі адток моладзі ў гарады, рэальная магчымасць знайсці шлюбную пару ў родных мясцінах, пабудаваць уласную хату, мець паўсядзённы доступ да вясковых звычаяў, ведаць і шанаваць іх, далучацца да святочных бясед, гуртавых спеваў, калян-

дарных абходаў і г. д. Тады і аказіянальная дыскрэтнасць святочных абрадаў істотна не ўплывае на стан традыцыі ў цэлым. Напрыклад, аднаго разу гурт жанчын з в. Ка́мень Пінскага раёна не вадзіў Куста з прычыны дрэннага надвор'я – увесь дзень ліў дождж. Але ў вялікіх вёсках «Кустаў» бывае некалькі, кожны вясковы канец водзіць Куста асобна. Не кожны год надвор'е псуецца менавіта на Тройцу, і. магчыма, не ўсе гурты такія пужлівыя, як гэты, тым больш, што ёсць яшчэ і дзіцячыя «Кусты». А ў в. Чамярын «Куст» ледзь не разладзіўся таму, што галоўная завадатарка з'ехала на вяселле, а без яе жанчынам было ніякавата. Але ж не ўсякі раз аматаркі кудысьці адбывалі!

Цяпер, калі, здаецца, ужо мінуў крызіс культурнай самаідэнтыфікацыі, калі на ўсіх узроўнях гучаць заклікі ахоўваць і адраджаць народныя традыцыі, калі актыўна трансліруюцца і замацоўваюцца ў свядомасці ўзоры святочна-абрадавай культуры беларусаў, прынцыпова важным уяўляецца пытанне, ці могуць яе страчаныя звёны аднавіцца спантанна, самі па сабе, без уплыву звонку, або ім наканавана ўзнаўленне толькі ў нетрадыцыйным кантэксце – сцэнічна-відовішчным? Хаця канкрэтных прыкладаў у нашым распараджэнні пакуль што няма, мяркуем, што тэарэтычна магчымасць стыхійнага аднаўлення існуе, бо нельга не заўважаць тэндэнцый рэпрэзентацыі народнай культуры ў сферы дашкольнага выхавання, сістэме сярэдняй адукацыі, сродках масавай інфарацыі і г. д.

Наш вопыт сведчыць, што пазначаныя фактары станоўча ўплываюць на рэпертуар мясцовых калектываў мастацкай самадзейнасці, якія добра ўсведамляюць, што яны цікавыя менавіта сваёй самабытнасцю, і таму імкнуцца прадэманстраваць сваё, роднае, непаўторнае. Напрыклад, гэта тычыцца абраду «Юраўская свечка», які паказаў гурт з в. Сіманічы Лельчыцкага раёна. Памятаюць, што гэты абрад выконваўся жанатай парай. Муж і жонка бралі з сабой грамнічную свечку і рытуальную ежу, прыходзілі на поле, рассцілалі тканы настольнік, станавіліся на калені, запальвалі свечку, маліліся, а потым абыходзілі навокал поля, каб засцерагчы ўраджай ад стыхійных бедстваў. З мэтай магічнага ўплыву на ўрадлівасць глебы закопвалі ў зямлю хлеб, косткі, рэшткі ежы. Некаторыя пары пасля вяртання ў вёску дадаткова абходзілі са свечкай двары родзічаў, а потым хавалі яе за бажніцу. А вось у в. Сініцкае поле існаваў звычай абыходзіць палі на Юр'я гуртам. Цікавая дэталь: па дарозе да поля жанчыны трымалі ў руках граблі з завязанымі на іх зялёнымі фартухамі, а калі вярталіся, то на граблях ужо палымнелі чырвоныя фартухі.

У якога святочнага абраду больш шанцаў на адраджэнне – сямейнага ці масавага? Пытанне застаецца адкрытым. Некаторыя вучоныя наогул вельмі адмоўна ставяцца да спроб штучнага адраджэння фальклорнай традыцыі, якія назіраліся ў краінах, дзе яна ўжо знікла. К. В. Чыстоў катэгарычна заяўляў, што «гэта не можа спыніць або павярнуць назад натуральную плынь гісторыка-культурнага працэсу» [4, *43*]. Сапраўды, павярнуць назад немагчыма. Справа зусім не ў гэтым, а ў натуральным жаданні цывілізаваных людзей хоць нейкім чынам, хоць у штучных формах не толькі захаваць памяць аб фальклорнай спадчыне сваіх продкаў, але і ўзбагаціць сучасную культуру ўзорамі непаўторнага народнага мастацтва.

На наш погляд, сапраўднае адраджэнне мясцовых святочна-абрадавых традыцый магчыма пры наяўнасці двух каталізатараў – знешняга і ўнутранага. Вядома, можна ў розных кутках Беларусі наладзіць купальскае свята і яно прыжывецца, бо няма чалавека, які б не ведаў пра Купалле, яго вогнішчы, папараць-кветку. Але ў тых мясцінах, дзе Купалля не было, яно доўгі час будзе ўсведамляцца не як сваё свята, а як новая традыцыя. Так, напрыклад, ставяцца да Купалля жыхары в. Моталь Іванаўскага раёна. Унутраны каталізатар аднаўлення традыцыі – гэта народная памяць аб ёй, жаданне і воля мясцовых жыхароў адрадзіць свята.

Знешнім каталізатарам можа стаць мэтанакіраваная практычная работа мясцовых улад, раённых аддзелаў культуры і навукова-метадычных цэнтраў культасветработы па падтрымцы лакальных традыцый і іх папулярызацыі. Лічым, што менавіта сукупнасць пазначаных фактараў паспрыяла адраджэнню ў в. Вялікае Палессе Лельчыцкага раёна святкавання Грамніц і унікальнага абраду ваджэння Маі.

Што сталася перадумовай? Пачнем з таго, што з 90-х гадоў мінулага стагоддзя ў Лельчыцах сталі праводзіцца раённыя агляды-конкурсы народных свят і абрадаў, а з 2001 г. – абрадавы кірмаш «З рога ўсяго многа», пры падрыхтоўцы якога акцэнт зрабілі на рэпрэзентацыю абрадаў, невядомых шырокаму колу. Вялікапалескі гурт выканаўцаў прывёз на кірмаш святочную кампазіцыю «Стрэчанне» і заняў першае месца. Як дата народнага календара Стрэчанне, або па-ранейшаму Грамніцы, існавала здаўна і з памяці не знікала. Знік сам звычай святкавання Грамніц з яго своеасаблівай драматургіяй, дыялогамі, вулічным шэсцем жанчын, якія ўпрыгожвалі невялічкую елачку і везлі яе на санках. Самае дзіўнае заключаецца ў тым, што свята, узноўленае па ўспамінах старых людзей і паказанае на кірмашы, адрадзілася да жыцця! І не па загаду, не па рэкамендацыі, а па ўнутранаму парыву жанчын, якіх падтрымалі свае вяскоўцы.

Што тычыцца абраду ваджэння Маі, то пра яго распыталі ў трох старэнькіх бабуль, апошніх, хто памятаў пра старадаўні траецкі звычай і ведаў галоўную абрадавую песню:

*Девкі на Тройцу*
*За сілом ходілі,*
*За собою оны*
*Маю воділі.*
*У чыёй хаті*
*Мая танцуе,*
*Овес і ячмень*
*Там колосуе.*

*У кого в дворэ*
*Маю воділі,*
*Грэчка й пшаніцы*
*В того родилі.*
*На с'яту Тройцу*
*Мая гуляла,*
*Нашым конікам*
*Грывы чэсала.*

Удзельніцы гурта, якому, відаць, у памяць аб сваёй перамозе на конкурсе і ў гонар адроджанага свята, далі назву «Грамніцы», – амаль усе людзі пенсійнага ўзросту, але да гэтага часу яны зусім не ведалі пра «Маю». У склад гурта ўваходзяць цудоўныя спявачкі, вельмі артыстычныя і натхнёныя: Баравая Валянціна (1948), Бух Марыя (1949), Бялоцкая Аляксандра (1938), Бялоцкая Люба (1956), Дрынеўская Марыя (1948), Кужалевіч Надзея (1952), Палын Ніна (1955), Радке Надзея (1956) і яе дачкашкольніца Таццяна, Светава Марыя (1953). У 2002 г. на кірмашы «З рога ўсяго многа» гурт «Грамніцы» пасля паказу «Маі», ролю якой выконвала Таццяна Радке, зноў заняў першае месца, прычым выступалі жанчыны ў аўтэнтычных строях, узноўленых імі самімі. Мала таго, аматаркі не толькі аб'ехалі 11 вёсак сельсавета, дзе прадэманстравалі ўзноўлены абрад, але і адрадзілі яго ва ўласнай вёсцы. Цяпер ён зноў існуе ў жывым бытаванні. Хочацца спадзявацца, надоўга, асабліва калі да Вялікага Палесся далучацца іншыя вёскі, дзе, можа, калісьці таксама хадзіла па палях, танцавала і часала грывы конікам прыгожая Мая.

«Жамчужынай Палесся» назваў кірмаш у Лельчыцах Паўнамоцны пасол ЗША Джон Кундштатэр, уражаны таленавітасцю палешукоў, характвом, багаццем і разнастайнасцю мясцовых абрадавых традыцый. А хто лічыў, колькі яшчэ духоўных скарбаў захоўвае Палессе, калі толькі ў Лельчыцкім раёне на пачатку XXI ст. выяўляюцца унікальныя з'явы народнай культуры!

Вядома, ва ўмовах глабалізацыі вельмі важна паспець захаваць самае каштоўнае – самабытную спадчыну кожнага народа, выкарыстоўваючы багатыя магчымасці сучаснай тэхнікі. Але пры гэтым нам трэба ўсведамляць, што творчы патэнцыял беларускага народа далёка не вычарпаны. Сучасныя

вяскоўцы не цёмныя і забітыя людзі. Яны пісьменныя, адукаваныя і, як высвятляецца, схільныя да культурнай самарэфлексіі, асэнсавання эстэтычнай каштоўнасці святочна-абрадавай спадчыны, яе гуманістычнай скіраванасці. Калі носьбіты традыцыйнага фальклору самі знаходзяць, узнаўляюць на сцэне і адраджаюць у жыцці амаль забытыя святочныя абрады, калі яны свядома папулярызуюць іх сярод суседзяў, як вялікапалескі гурт «Грамніцы», то ці не знакі гэта новай культурнай сітуацыі, якую даследчыкі павінны грунтоўна асэнсаваць, вывучыць, зрабіць высновы? Бачна, што быццам нанава ствараецца падмурак для натуральнай пераемнасці старажытных абрадавых спеваў, спадчына ўваходзіць у культурнае жыццё палескіх вёсак, узбагачаючы агульную карціну святочна-абрадавай сферы беларускага народа. Стварэнне навукова-метадычнай і практычнай базы для самаразвіцця традыцыі як галоўнага механізму акумуляцыі, перадачы і актуалізацыі духоўнага вопыта, як сістэмы сувязей паміж мінулым, цяперашнім і будучым павінна стаць адным з прыярытэтных кірункаў дзяржаўнай палітыкі ў галіне народнай культуры.

## ЛІТАРАТУРА


1. Земляробчы каляндар (Абрады і звычаі). / Уклад. А. І. Гурскі. Мн., 1990.

2. *Можейко З. Я.* Песенная культура белорусского Полесья. Село Тонеж. Мн., 1971.

3. Разнастайнасць моў і культур у кантэксце глабалізацыі // Матэрыялы Міжнароднага сімпозіума. Мінск, 9–10 ліпеня 2002 г. У 2-х кн. Кн. 1. Мн., 2003.

4. *Чистов К. В.* Народные традиции и фольклор. Очерки теории. Л., 1986.